1



2



3



4



5



6



7



8



9



10



11



12



13



14



15



16



17



18



19



20



21



22



23



24



25



26



## Парады да мантажу садовых барбекю BUSCHBECK




10 – Дызайнерская накрыўка коміну

9 – Падаўжэньне коміну

8 – Вонкавы падмурак коміну

7 – Унутраны падмурак коміну

6 – 3 вогнетрывалыя часткі печы

5 – Печ

4 – Зольшчык для печы

3 – Стальніца

2 – Дрывотня

1 – Падмурак

Для усталяваньня садовага барбекю у Вас мае быць ходнікавая, бетонная ці ўтрамбаваная пясочная пляцоўка. Узгаральныя матэрыялы павінны знаходзіцца на адлегласьці больш за 1м ад барбекю. Падмурак барбекю (1) усталеўваецца гарызантальна. Прытрымлівайцеся малюнкаў 1-26, каб усталяваць элементы (1) – (10). Калі ласка, не кладзіце на зямлю элементы бачным бокам уніз, каб не запэцкаць іх.

Забяспечце аднолькавую адлегласьць паміж унутраным і вонкавым падмуркамі коміну (7) (8). Дзякуючы гэтаму, будзе адбывацца вольны рух паветра паміж названымі элементамі і памяншэньне нагрэву барбекю звонку для Вашай бясьпекі і бясьпекі Вашых блізкіх.

Рупліва зьбірайце ўсе элементы барбекю ў плоскасьці ззаду за выключэньнем вонкавага падмурку коміна (8), які павінен вытыркацца на 2см ззаду.

Разьмяшчайце ўсе элементы сіметрычна адносна цэнтру, кантралюючы роўнасьць адлегласьцяў з дзвюх бакоў (калі ласка, кіруйцеся малюнкам 9).

Мы раім кропкавае склейваньне ўсіх элементаў растворам для швоў, які ўваходзіць у стандартны камплект барбекю. Аднак жа швы ўсіх элементаў коміну, пачынаючы з вонкавага падмурку коміну (8), трэба шчодра кітаваць. Для фіксаваньня задняй вогнетрывалай частцы печы неабходна нанесьці раствор у шчыліну паміж гэтай часткаю і печчу (калі ласка, глядзіце малюнак 12).

Пакунак раствору для швоў вагай 1,5кг трэба высыпаць у пасудзіну з ня больш чым 0,5л вады і рупліва разьмяшаць. Зручней працаваць з больш густым растворам. Час высыханьня раствору для швоў складае прыкладна 24 гадзіны.

Стандартны камплект Вашага барбекю складаецца з:

1 садовае барбекю;

1 раствор для швоў;

1 храміраваная рашотка для гатаваньня страваў.

villabella .by

*калі блізкія поруч…*